# АЎТОГРАФ «КУПАЛАЎЦАЎ»

*Артысты Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Купалы Валянцін Сяргеевіч Белахвосцік (народны артыст Беларусі) і Галіна Францаўна Бальчэўская ў Любань прыехалі не ўпершыню. Разам з калегамі ў 60-70-я гады некалькі разоў выступалі тут, прывозячы да вяскоўцаў спектаклі па п'есах Андрэя Макаёнка (а драматург гэты — адзін з самых папулярных у рэпертуары тэатра. Па словах артыстаў, ім нават жартам прапаноўвалі назваць тэатр імем Макаёнка).*

*У спектаклі «Таблетку пад язык» В.С.Белахвосцік выконваў ролю старшыні калгаса Каравая — і цяпер прачытаў яго заключны маналог. А Г.Ф.Бальчэўская праспявала песню Надзеі з другой п'есы Макаёнка — «Трыбунал».*



**Народны артыст Рэспублікі Беларусь В.С.БЕЛАХВОСЦІК.**

Жадаем Вам артыстызму у газеце — як мы іграем на сцэне, каб Вы так ігралі словам!

З найлепшымі пажаданнямі
артысты тэатра ім. Янкі Купала
Г. Ф. Гальпёрская
Нар. артыст РБ В. С. Белахвосцік
1.09.96 г.